✓**30 студзеня** стартаваў новы праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі – **«100 дзён да Вялікай Перамогі. Па старонках беларускіх газет 1945 г.»**, прымеркаваны да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Скончыцца ён сёлета 9 мая.

Штодня на партале НББ і на сайце «Беларусь у інфармацыйнай прасторы» выстаўляюцца матэрыялы, што адлюстроўваюць хроніку навінаў і падзеяў з публікацыяў адпаведнага перыяду ў газетах Савецкай Беларусі 1945 г. Нагадаем, што напачатку 1945-га Чырвоная Армія рухалася на Захад, баі ішлі далёка за межамі БССР, а ў самой рэспубліцы адразу ж пасля вызвалення акупаванай тэрыторыі пачалася праца па аднаўленні інфраструктуры, прадпрыемстваў, жылых будынкаў, узнаўленні дзейнасці ўстаноў і арганізацыяў – усё гэта патрабавала ад жыхароў вялікіх і малых гарадоў і вёсак напружання фізічных і маральных сілаў, поўнай аддачы, самаахвярнасці. Пасля асноўнай працы гараджане расчышчалі вуліцы, разбіралі завалы; у вёсках людзі адбудоўваліся, наладжвалі працу на палях і фермах; школьнікі і студэнты вучыліся, дапамагалі старэйшым; моладзь удзельнічала ў спартыўных спаборніцтвах. Пра гэта пісаліся артыкулы, рэпартажы, агляды на старонках айчыннай перыёдыкі.

✓**3 лютага** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адбылося **адкрыццё выстаўкі твораў «Іран – калыска цывізізацый»**, прымеркаванай да 41-й гадавіны перамогі Ісламскай рэвалюцыі ў Іране. Выстаўка арганізаваная